ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА КУЛЬТУРЫ
“ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕТКА АСІПОВІЦКАГА РАЁНА”

# КОВАЛЬ
# Ганна Іванаўна

## бібліяграфічны нарыс



«Сярод беларускіх партызан было шмат дзяўчат і жанчын, якія, падобна Ціне Слёзінай і Ані Коваль, не шкадавалі сябе дзеля разгрому ворага і вызвалення свайго народа ад фашысцкага іга, ішлі на верную смерць, здзяйснялі бессмяротныя подзвігі».

З кнігі У. К. Якавенкі «На акупіраванай зямлі»



Яскравым прыкладам самаадданай мужнасці ў суровыя дні нямецка-фашысцкай акупацыі можа служыць дзейнасць асіповіцкай падпольшчыцы і партызанскай разведчыцы Ганны Іванаўны Коваль.

Нарадзілася Ганна Іванаўна 18 сакавіка 1923 года ў Кіеве ў сям'і рабочага. У 1933 годзе разам з бацькамі пераехала ў г. Асіповічы. Вучылася ў чыгуначнай школе № 36, перад вайной закончыла 9 класаў.

З жахам і гневам глядзела Аня на спалены горад, на дэспатызм фашысцкіх улад, якія насаджалі нечалавечы так званы «новы парадак». Яна часта хадзіла ў в. Кабылянка Градзянскага сельсавета, дзе ўжо ў 1941 годзе дзейнічала невялікая партызанская група. Пачынаючы са жніўня ў кошыку з ягадамі і грыбамі яна дастаўляла зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі.

Да канца 1941 года з надзейных сяброў і родзічаў стварылася камсамольска-маладзёжная група, у якую ўваходзілі Аня Коваль, Іван Коваль, Лёня Урбановіч, урач Уладзімір Кіржаманаў, Іван Наркевіч, Ігар Чарэпка, лейтэнант Гоўсей і інш.

Падпольшчыкі сабралі радыёпрыёмнік і па вечарах слухалі паведамленні з Масквы, запісвалі іх, а раніцай, у выглядзе лістовак, распаўсюджвалі па горадзе, пераказвалі вусна сябрам і знаёмым, разам са сваімі сябрамі-падпольшчыкамі дапамагалі ваеннапалонным уцякаць з лагера, даставалі пропускі, збіралі медыкаменты, боепрыпасы.

У чэрвені 1942 года Аня сустрэлася з партызанамі групы Аляксея Кудашова і стала разведчыцай — сувязной атрада. Дзякуючы ёй і яе таварышам у партызанскі атрад уступілі радыётэхнік Саша Батурлін (Батарын), Іван Коваль, Саша Колас,

Георгій Цыганкоў і інш. Аня дастаўляла ў партызанскі атрад медыкаменты, якія перадаваў ёй урач У. І. Кіржаманаў, зброю, боепрыпасы, соль, разведданыя аб дыслакацыі нямецкіх войскаў у Асіповічах і ваколіцах горада, звесткі аб праходзячых праз горад эшалонах і г.д. З атрада дастаўляла ў Асіповічы зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі і газеты.

Аня пасябравала з настаўніцай з в. Паршчыха Цінай Слёзінай, якая была разведчыцай партызанскага атрада імя Варашылава.

У канцы ліпеня 1942 года Аня і Ціна вырашылі вывезці з Асіповіч партызанам сабраныя падпольшчыкамі горада станковы кулямёт, гранаты, боепрыпасы, радыёпрыёмнік, медыкаменты. Усё гэта яны пагрузілі на падводу і пад вечар паехалі ў бок в. Карытнае. Пры выездзе з горада іх падводу спынілі немцы. Аня і Ціна аказалі супраціўленне, але сілы былі няроўныя, іх схапілі і перадалі тайнай палявой паліцыі.

Камандаваннем партызанскага атрада былі зроблены захады для выратавання Ані і Ціны. У г. Асіповічы быў пасланы на разведку партызан Васіль Гарачых. Аднак гітлераўцам праз свайго агента ўдалося даведацца пра намер партызан. Яны спрабавалі ўзяць Васіля Гарачых жывым, але мужны патрыёт аказаў супраціўленне, пры гэтым ён забіў чатырох фашыстаў і ўзарваў сябе і акружыўшых яго немцаў гранатай.

Два тыдні днём і ноччу вёўся допыт Ані і Ціны ў засценках тайнай палявой паліцыі. Гітлераўскія каты пускалі ў ход самыя вытанчаныя катаванні. Але мужныя патрыёткі вытрымалі ўсё і не выдалі сваіх сяброў. Не атрымаўшы ад Ані і Ціны ніякіх звестак, 13 жніўня 1942 года іх расстралялі.

Не суджана было дажыць да перамогі і брату Ані Івану Ковалю. Разам з партызанамі групы разведкі пад камандаваннем С. С. Сумчанкі зімой 1944 года ён быў акружаны гітлераўцамі ў лесніцоўцы Сташэўскага і ў няроўным баі загінуў смерцю героя. Хутка памёр і бацька Ані, і толькі яе маці дажыла да дня Перамогі.

У студзені 1943 года гітлераўскія карнікі спалілі в. Паршчыха разам з усімі яе жыхарамі, там загінула і 5-гадовая дачка Ціны Слёзінай Надзея.

## Літаратура

Коваль А. И. — организатор Осиповичского подполья. // Их именами названы... : энциклдедический справочник. — Минск : БелСЭ, 1987. — С. 282—283.

Чахольскі, С. Л. Разведчыца Аня / С. Л. Чахольскі // Памяць. Асіповіцкі раён. — Мінск, 2002. — С. 253—254.

Коваль Анна Ивановна [Электронный ресурс] // Will-remember.ru : сайт. — Режим доступа: http://will-remember.ru/familii_na_k/koval_anna_ivanovna.htm